Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»
Исторический факультет

# БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННОСТЬ: ИСТОКИ, СТАНОВЛЕНИЕ, РАЗВИТИЕ (IX–XXI вв.)

Материалы
Республиканской научно-теоретической конференции

Минск, 29 июня 2017 г.

Минск
РИВШ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 323(476)(091)(082)
ББК 66.3(4Беи)я43
Б43

Р е к о м е н д о в а н о

советом исторического факультета
УО «Белорусский государственный педагогический
университет имени Максима Танка»
(протокол № 10 от 24 мая 2017 г.)

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я :
кандидат исторических наук доцент *А. В. Касович* (отв. ред.);
кандидат исторических наук доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат исторических наук доцент *А. А. Корзюк;*
кандидат исторических наук доцент *А. Ф. Великий*

Р е ц е н з е н т ы :
доктор исторических наук профессор *А. М. Лютый;*
доктор исторических наук профессор *И. В. Варивончик*

Б43 **Белорусская** государственность: истоки, становление, развитие (IX–XXI вв.) : материалы Респ. науч.-теорет. конф., Минск, 29 июня 2017 г. / редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2017. – 232 с.
ISBN 978-985-586-041-0.

В сборнике представлены актуальные материалы исследований, посвященные проблемам белорусской государственности в историческом, социально-культурном и геополитическом аспектах.
Адресуется преподавателям, аспирантам и студентам вузов.

**УДК 323(476)(091)(082)**
**ББК 66.3(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-586-041-0**

© Оформление. ГУО «Республиканский институт высшей школы», 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*СЕКЦИЯ 4. БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННОСТЬ НА СОВЕТСКОЙ ОСНОВЕ*

## РЭПАРАЦЫІ З ГЕРМАНІІ Ў БССР У 1945–1948 ГГ.

***Абрамчык К.Б., аспірант, БДПУ, Мінск***

Пытанне рэпарацый як віда матэрыяльнай адказнасці суб'екта права за страты, нанесеныя ў выніку здзейсненага ім міжнароднага правапарушэння, з'яўляецца актуальнай праблемай сучаснай айчыннай гістарычнай навукі.

На Ялцінскай і Берлінскай канферэнцыях кіраўнікоў трох саюзных дзяржаў – СССР, ЗША і Вялікабрытаніі – былі вызначаны прававыя асновы ўзымання рэпарацый з Германіі, устаноўлены памеры і формы рэпарацый для СССР і іншых краін антыгітлераўскай кааліцыі.

Саюзнікі вызначылі агульны аб'ём рэпарацый з Германіі ў 20 млрд дол., з якіх палову, 10 млрд дол., атрымоўваў СССР [12, с. 472].

БССР як частка СССР павінна была атрымаць 1,5 млрд дол., што было ў 10 разоў менш за прамыя народагаспадарчыя страты Беларусі ў выніку вайны [13, с. 172].

Арганізацыйная падрыхтоўка да збірання рэпарацый з Германіі на карысць СССР пачалася адразу пасля Ялцінскай канферэнцыі (4 – 11 лютага 1945 г.).

Рэпарацыі браліся ў трох формах: 1) прамысловага абсталявання, 2) таварных паставак прадукцыі, 3) працы ваеннапалонных [11, с. 253].

Пастаўкі па рэпарацыях на тэрыторыю БССР пачаліся яшчэ да сканчэння Вялікай Айчыннай вайны.

Ужо 21 лютага 1945 г. была прынята пастанова Дзяржаўнага Камітэта Абароны (ДКА) аб стварэнні пры франтах пастаянных камісій па дэмантажу і аб парадку вывазу прамысловага абсталявання з Польшчы і Германіі [2, с. 24].

25 лютага 1945 г. быў створаны Асобы камітэт па Германіі пры ДКА, галоўнай задачай якога стала каардынацыя дзейнасці па дэмантажных работах. Пасля скасавання ДКА СССР 4 верасня 1945 г. Асобы камітэт перайшоў у падпарадкаванне СНК СССР [1, с. 39].

6 чэрвеня 1945 г. пастановай СНК СССР з мэтай кантроля за выкананнем Германіяй умоў капітуляцыі і кіравання савецкай зонай акупацыі Германіі была створана Савецкая ваенная адміністрацыя ў Германіі (СВАГ), якую ўзначаліў маршал Г.К. Жукаў [10, с. 21].

Пасля заканчэння ваенных дзеянняў і першых месяцаў акупацыі Германіі пытанні рэпарацый уваходзілі ў кампетэнцыю Эканамічнага ўпраўлення Савецкай ваеннай адміністрацыі ў Германіі (СВАГ) на чале з генералам Шабаліным. У снежні 1945 г. яго функцыі перайшлі да намесніка галоўнакамандуючага СВАГ па эканамічных пытаннях К.І. Коваля [10, с. 841].

У адрозненні ад Асобага камітэта пры ДКА, які займаўся дэмантажнымі работамі, СВАГ займаўся пераважна кантролем за рэпарацыямі з бягучай германскай вытворчасці.

Зборамі і адпраўкай у СССР каштоўнай маёмасці займаліся непасрэдна два віды падраздзяленняў: трафейныя каманды Чырвонай Арміі і дэмантажныя каманды, падначаленыя Асобаму камітэту пры ДКА. Дзейнасць ведамстваў амаль не каардынавалася паміж сабой [2, с. 25].

Дэмантаж і перавозка ў СССР дэмантаванага абсталявання і матэрыялаў вымусілі саюзнае кіраўніцтва стварыць 5 перавалачных баз для яго захоўвання – чатыры на тэрыторыі Польшчы і адну – у Брэсце. Саюзныя наркаматы, якія атрымоўвалі гэтае абсталяванне арганізоўвалі часовыя склады. У Мінску такія склады меліся ў наркаматаў сярэдняга машынабудавання, авіяцыйнай прамысловасці і электрастанцый. На іх дастаўляліся матэрыялы і абсталяванне, якія потым перапраўлялася ў цэнтральныя вобласці СССР. Абсталяванне, якое прадназначалася для Украіны, Беларусі і Прыбалтыйскіх рэспублік, паступала непасрэдна на прадпрыемствы гэтых рэспублік [1, с. 40].

8 мая 1945 г. сумеснай пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР №648–275 сс была створана аператыўная група пры СНК БССР. Група павінна была займацца кантролем работы наркаматаў па вывазу прамысловых прадпрыемстваў, абсталявання, сельскагаспадарчага



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

інвентару і іншай маёмасці ў БССР, а таксама падрыхтоўкай прапаноў для ўнясення ў Асобы камітэт пры ДКА.

У Апергрупу ўваходзіла 5 чалавек: М. Прохараў, загадчык ваеннага аддзела ЦК КП(б)Б; І. Куцейнікаў (СНК БССР); І. Жыжаль (Дзяржплан БССР); А. Андрэеў (прамысловы аддзел ЦК КП(б)Б); К. Антонаў (намеснік наркама земляробства БССР) [1, с. 40].

Рашэннем ЦК КП(б)Б і СНК БССР у маі 1945 г. для выяўлення, уліку, дэмантажу і вывазу абсталявання з Германіі ў БССР былі створаны і накіраваны ў савецкую акупацыйную зону спецыяльныя ўрадавыя групы: Берлінская (цэнтральная – кіраваў М. Кагальніцкі), Памеранская (Гарачкін), Брандэнбургская (Кальніцкі), Саксонская (Дружалоўскі), Мекленбургская (Крывашэеў), Саксонска-Ангальцкая (Захватаў), Цюрынгская (Кармілкін) [9, арк. 1].

У цэлым за 1945-1948 гг. у Германіі па дэмантажу працавала звыш 800 чалавек з Беларусі [9, арк. 2].

Усяго з савецкай зоны акупацыі Германіі ў Беларусь з мая 1945 г. па 1 снежня 1948 г. было вывезена 21 602 вагоны агульнай вагой 268 829 т. рознага абсталявання, металаканструкцый, інструментаў і матэрыялаў [9, арк. 2].

Найбольшыя паступленні рэпарацый былі ў 1945-1947 гг. У 1948 г. адбылося значнае скарачэнне рэпарацыйных паставак, а ў 1949-1950 гг. назіраюцца толькі асобныя выпадкі. Афіцыйна паступленне германскіх рэпарацый у СССР спыніліся з 1 студзеня 1954 г. [5, с. 17].

Агульная колькасць абсталявання, якое было дастаўлена на беларускія заводы і арганізацыі, склала 59 848 адзінак [1, с. 41].

Рэпарацыі паступалі ў БССР у выглядзе прамысловага абсталявання, транспартных сродкаў, сыравіны і паўфабрыкатаў для вытворчасці, гатовай прадукцыі, спажывецкіх тавараў, харчовых прадуктаў, жывёлы і г. д.

Сваім ходам да пачатку 1947 г. у Беларусь было прыгнана 130 430 коней, 137 847 галоў буйной рагатай жывёлы [3, с. 237].

Рэпарацыйнае прамысловае абсталяванне размяркоўвалася наступным чынам: для міністэрстваў і арганізацый рэспубліканскага падпарадкавання было вывезена 32 147 адзінак, саюзна-рэспубліканскага – 6985, саюзнага – 20 716 [9, арк. 7].

Абсалютная большасць абсталявання – 16 483 адзінкі – складалі сельскагаспадарчыя машыны, другі радок займала абсталяванне станкабудаўнічай, машынабудаўнічай, металаапрацоўчай і ліцейнай вытворчасці – 11 346 адзінак, трэці радок займала абсталяванне тэкстыльнай і трыкатажнай прамысловасці – 7176 [9, арк. 7-10]. Астатняе абсталяванне размяркоўвалася практычна па ўсіх галінах вытворчасці, якія існавалі ў БССР.

Выкарыстоўвалася праца ваеннапалонных і інтэрніраваных: у 1946 г. на тэрыторыі Беларусі іх было каля 103 тыс. чалавек [3, с. 237].

Рэпарацыі атрымлівалі практычна ўсе прадпрыемствы, якія аднаўляліся альбо нанова будаваліся. Згодна дадзеных на 1 студзеня 1947 г., прадпрыемствы рэгіёнаў БССР атрымалі наступную колькасць вагонаў з рэпарацыйным абсталяваннем: Бабруйская вобласць – 316 вагонаў, Баранавіцкая вобласць – 415 вагонаў, Брэсцкая вобласць – 350 вагонаў, Віцебская вобласць – 2401 вагон, Гомельская вобласць – 1 895 вагонаў, Гродзенская вобласць – 555 вагонаў, Магілёўская вобласць – 2223 вагоны, Маладзечанская вобласць – 19 вагонаў, Мінская вобласць (без уліку г. Мінска) – 293 вагоны, Палеская вобласць – 62 вагоны, Пінская вобласць – 223 вагоны, Полацкая вобласць – 12 вагонаў. [8, арк. 2].

Найбольшая колькасць рэпарацыйнага абсталявання паступіла на заводы г. Мінска.

За перыяд з 1945 г. па верасень 1947 г. прадпрыемствы і арганізацыі Мінска атрымалі 8 113 вагонаў з абсталяваннем і матэрыяламі агульнай сумай у 158 170,1 тыс. руб. [6, с. 81].

У сталіцы галоўнымі атрымацелямі абсталявання былі Мінскі аўтамабільны завод, Мінскі трактарны завод і Мінскі велазавод. Так, па стану на 1 верасня 1947 г. на МАЗ прыбыла 972 вагоны с рэпарацыйным абсталяваннем, якое было дэманціравана з 7 нямецкіх прадпрыемстваў (3 235 адзінак станкоў), МТЗ атрымаў 511 вагонаў, а Мінскі велазавод – 753 вагоны з абсталяваннем [6, с. 81].



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Пры гэтым трэба адзначыць, што эфектыўнасць выкарыстання значнай часткі накіраванага ў СССР і БССР абсталявання была вельмі нізкай.

Мелі месца выпадкі непрыгоднасці абсталявання, некамплектацыі, што выяўлялася ўжо пасля прыбыцця грузаў на беларускія прадпрыемствы [7, арк. 38].

Даволі часта каштоўнае абсталяванне прыбывала ў дрэннай упакоўцы і не змазаным, разгрузка ажыццяўлялася з вялікімі цяжкасцямі з-за адсутнасці неабходнага транспарту (цягачоў) і пад'ёмных кранаў [7, арк. 39].

Зафіксаваны выпадкі крадзяжу грузаў і няпоўнага прыбыцця маёмасці, падмены новага абсталявання на старое [7, арк. 99].

Але самай вялікай праблемай стала адсутнасць складскіх памяшканняў для ўтрымання і захоўвання атрыманага з Германіі абсталявання. У выніку гэтага абсталяванне даволі часта захоўвалася пад адкрытым небам і з цягам часу станавілася непрыдатным для далейшага выкарыстання. Так, напрыклад, падобныя парушэнні былі выяўлены на буйнейшых заводах краіны, сярод іх: МАЗ, МТЗ, Віцебскі станкабудаўнічы завод ім. Кірава, Добрушская папяровая фабрыка "Герой Працы" і інш. [7, арк. 39].

Напрыканцы 1948 г. група СНК БССР па дэмантажу абсталявання ў Германіі была ліквідавана [1, с. 42]. Такім чынам, амаль трохгадовая праца па дэмантажу і перавозцы прамысловага абсталявання з Германіі ў Беларусь была завершана.

Нягледзячы на тое, што БССР атрымала толькі 2,8% ад агульнага ліку рэпарацыйнага абсталявання (у параўнанні, РСФСР атрымала 70,6%, а УССР – 21,0% [6, с. 78]), яго мантаж і выкарыстанне на заводах краіны ў значнай ступені спрыялі не толькі надзвычай хуткаму аднаўленню прамысловасці БССР, але і яе імкліваму развіццю, змене асноўнай спецыялізацыі. Так, у 1955 г., калі ў лік дзеючых уступілі ўсе адноўленыя і пабудаваныя пасля вайны прадпрыемствы, выпуск прамысловай прадукцыі ў БССР у параўнанні з 1945 г. павялічыўся ў 12 разоў, а ў параўнанні з 1940 г. – амаль у 2,5 разы [1, с. 238].

Выкарыстанне падчас аднаўлення эканомікі БССР параўнальна высокатэхналагічнага нямецкага абсталявання, у тым ліку з многіх ваенных аб'ектаў Германіі, спрыяла пераўтварэнню Беларусі ў пасляваенныя гады ў адзін з найбольш прамыслова развітых рэгіёнаў СССР.

**Літаратура**


1. Барабаш, Н.В. Рэпарацыі з Германіі ў Беларусь ў 1945 – 1948 гг. / Н.В. Барабаш // Весці НАН РБ. – 2015. – № 4. – С. 38–42.
2. Болдырев, Р.Ю. Советская оккупационная политика в Германии, 1945-1949: экономический аспект / Р.Ю. Болдырев . – Saarbrücken: LAP Lambert Academic Publishing, 2011. – 251 с.
3. Бушчык, Г.П. Выкарыстанне рэпарацый для аднаўлення гаспадаркі Беларусі пасля Другой сусветнай вайны / Г.П. Бушчык // XXI век: актуальные проблемы исторической науки: Материалы междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ. Минск, 15–16 апр. 2004 г. / Редкол.: В. Н. Сидорцов. (отв. ред.) и др. – Мн: БГУ, 2004. – С. 237–238.
4. Бушчык, Г.П. Эканамічныя сувязі Беларусі ў перыяд аднаўлення гаспадаркі пасля Вялікай Айчыннай вайны: новыя даследаванні / Г.П. Бушчык // Веснік БДУ. – 2005. – Сер. 3. – № 2. – С. 40–45.
5. Концевой, П. А. Немецкие репарации в восстановлении промышленных предприятий БССР (1945 – начало 1950-х гг.) / П. А. Концевой // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. – 2013. – № 1 (41). – С. 15–19.
6. Концевой, П. А. Поступление репарационного промышленного оборудования в БССР (1945–1950 гг.) / П. А. Концевой // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2014. – № 1. – С. 77–85.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 93. Воп. 9. Спр. 1041.
8. НАРБ. – Ф. 93. Воп. 9. Спр. 1048.
9. НАРБ. – Ф. 899. Воп. 1. Спр. 3.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10. Советская военная администрации в Германии, 1945–1949. Справочник / отв. ред.: Я. Фойтцик, Т. В. Царевская-Дякина, А. В. Доронин; при участии: Х. Кюнцель, Д. Н. Нохотович. – М.: РОССПЭН, 2009. – 1031 с.

11. Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны, 1941 – 1945 гг.: Сборник документов / М-во иностр. дел СССР.: в 6 т. / редкол.: А.А. Громыко (гл. ред.) [и др.]. – М.: Политиздат, 1978–1984. – Т. 4. Крымская конференция руководителей трех союзных держав – СССР, США и Великобритании (4 – 11 февр. 1945 г.). – 1984 г. – 302 с.

12. Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны, 1941 – 1945 гг.: Сборник документов / М-во иностр. дел СССР.: в 6 т. / редкол.: А.А. Громыко (гл. ред.) [и др.]. – М.: Политиздат, 1978–1984. – Т. 6. Берлинская (Потсдамская) конференция руководителей трех союзных держав – СССР, США и Великобритании (17 июля – 2 авг. 1945 г.). – 1984 г. – 511 с.

13. Снапкоўскі, У.Е. Рэпарацыі / У.Е. Снапкоўскі // Энцыкл. гіст. Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993 – 2003. – Т. 6. Кн. 1 / Г.П. Пашкоў [і інш.]. – 2005. – 592 с. – С. 172–173.

## ПАЛІТЫКА БЕЛАРУСІЗАЦЫІ Ў КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

***Альховік М.К., лячэбны факультэт, БДМУ, Мінск***
***навук. кір. – Зялінскі П.І., доктар гістарычных навук, прафесар***

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. савецкая ўлада абвясціла аб праве нацый на самавызначэнне ажно да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў. Пад нацыяй разумелася агульнасць людзей, якая гістарычна склалася і валодала агульнасцю мовы, тэрыторыі, эканамічнага жыцця, псіхічнага складу, культуры [17, с. 6-8]. Беларусы ўспрымаліся як асноўная, тытульная нацыя БССР, таму з першай паловы 1920-х гг. магістральным напрамкам нацыянальнай палітыкі ў БССР з'яўлялася беларусізацыя, накіраваная на пераадоленне наступстваў русіфікацыі, забеспячэнне дамінуючага становішча беларускага пралетарыяту, беларускай мовы і беларускай сацыялістычнай культуры ў БССР і трансфармацыю беларускай "буржуазнай" нацыі ў "сацыялістычную". У рамках беларусізацыі праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на перавод дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў на беларускую мову для абслугоўвання на ёй тытульнага насельніцтва, вылучэнне працоўных беларусаў на адказныя і кіраўнічыя пасады, выхаванне нацыянальнай самасвядомасці і забеспячэнне колькаснай перавагі беларусаў у складзе пралетарыяту і інтэлігенцыі, папулярызацыю беларускай мовы і культуры сярод нацыянальных меншасцяў БССР, вывучэнне гісторыі, геаграфіі, эканомікі Беларусі, традыцый і побыту насельніцтва, беларускай мовы і культуры, будаўніцтва сацыялістычнай культуры замест «буржуазнай надкласавай» [4, с. 27]. Палітыка беларусізацыі разглядалася ў якасці неабходнай умовы ажыццяўлення дыктатуры пралетарыяту, эканамічнага і культурнага ўздыму БССР, умацавання дзяржаўнай граніцы, узмацнення прасавецкіх сімпатый за мяжой і недапушчэння выхаду БССР са складу СССР [9, арк. 23-24].

Іншыя ўяўленні аб беларусізацыі мела частка партыйна-савецкіх дзеячаў і прадстаўнікоў беспартыйнай інтэлігенцыі, якія лічылі нацыянальнае пытанне самадастатковым, разглядалі БССР як правобраз нацыянальнай дзяржавы, а беларусізацыю як маштабны праект і важны этап нацыянальнага адраджэння, сродак узмацнення нацыянальнай свядомасці, палітычнай актыўнасці і самаарганізацыі беларусаў. Ідэйна-палітычныя ўяўленні гэтага асяроддзя грунтаваліся на неабходнасці гаспадарчай і палітычнай аўтаноміі і культурнага адасаблення БССР, паскарэння тэмпаў беларусізацыі і нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў этнаграфічных межах рассялення беларусаў, папулярызацыі беларускай нацыянальнай ідэі, традыцый і гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Кіраўніцтва БССР асцерагаліся з'яўлення палітычнай стратэгіі, накіраванай на канстытуіраванне альтэрнатыўных савецкай уладзе палітычных эліт, надкласавай палітычнай нацыі і мадэрнізацыі БССР па капіталістычным шляху [2, с. 28, 32; 18, с. 35]. Адначасова ў БССР існавала сацыяльная група прыхільнікаў асіміляцыі няpускага



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ